# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ АПОВЕСЦЬ. АДЗНАКІ ЖАНРУ

**А.М. Аўчарэнка**

Сучасная беларуская проза і зараз існуе найперш у звыклых і сфармуляваных папярэднікамі традыцыях. І нават нягледзячы на з'яўленне новых тэкстаў з выразна акрэсленым постмадэрнісцкім уплывам, літаратура ў "звыклых" формах працягвае сваё інтэнсіўнае жыццё і сёння. Аднак гэтую традыцыйнасць на варта ўспрымаць як недахоп або заганy. Яна – найперш уласцівасць, адметная рыса беларускага культурнага кантэксту, тое, што валучае і адрознівае нас ад шэрагу ад шэрагу іншых культур. Можа, таму большасць пісьменнікаў і не імкнуцца зрабіць свой тэкст больш сучасным і мадэрновым, бо не бачаць сэнсу ў гэтым адрыве ад традыцыйнага літаратурнага жыцця Беларусі. Да таго ж, гэтая традыцыя можа быць і вынікам імкнення захаваць адметнае культурнае аблічча нашае краіны. Ды і адмысловыя высілкі напісаць "па-новаму", так, "як у іншых літаратурах" заўсёды будуць марнымі, бо яны – толькі плод перайманне.

Але, улічваючы ўсё вышэй сказанае, нельга гаварыць пра беларускую культуру як пра нешта закансерваванае. Яна працягвае захоўваць сваю здольнасць да развіцця, але ў сваіх, адметных кірунках. Таму і літаратурныя творы нельга выстраіць у шэраг або скласці з іх, як з элементаў мазаікі, выразны малюнак, у якім усё вызначана і ўсё на сваіх месцах, бо кожны твор нясе ў сабе нешта новае і адрознае.

Такая сітуацыя характэрна і для развіцця жанру сучаснай беларускай аповесці. Кірункі, пра якія вялася размова, сапраўды вельмі шырокія – ад дакументальна-гістарычных твораў (А. Федарэнка "Нічыё") да прыгодніцка-рамантычных (Л. Рублеўская "Сэрца мармуровага анёлу") і твораў на ваенную тэму (В. Быкаў "Балота"). Пералік толькі ўжо гэтых аповесцяў дазваляе выявіць тое новае, што набывае беларуская літаратура. Так, у ёй усё мацней замацоўваюцца рэаліі нашага сучаснага жыцця – безладнага і



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

хаатычнага, драпежнага і спакуслівага, якое, тым не менш, трымаецца на асновах той самай, ужо згаданай беларускай традыцыі. Размова вядзецца найперш пра твор Л. Рублеўскай "Сэрца мармуровага анёлу", у якім хаос сучаснасці саступае вечнаму каханню і людскай спагадлівасці. Такім чынам, літаратура працягвае сцвярджаць ідэалы і першакаштоўнасці дабра, любові і чалавечнасці. Праўда, далёка не ўсе сучасныя аўтары здольныя выпісаць рацэпт ад "хваробы". Зрэшты, яны і не імкнуцца да гэтага. Ды і навошта, калі кожны чалавек робіць свой уласны выбар і толькі сам мусіць адказваць за яго. Больш важным з'яўляецца ваяўленне сутнасці пэўнай з'явы. Гэта датычыць найперш творчасці традыцыяналіста А. Федарэнкі, а дакладнай кажучы, яго аповесці "Нічыё". Традыцыя традыцыяй, але твор аўтара пры ўсім пры гэтым нельга назваць тыповым. У гэтым і таямніца таленту Федарэнкі, бо напісана ўсё па законах рэалізму і тэма для літаратуры не новая, але ёсць і тое, што дазваляе казаць пра наватарства празаіка. А яно – у раскрыцці існасці рэчаў, ва ўменні звязаць гісторыю з сучасным беларускім кантэкстам. Здаецца, што агульнага паміж адлюстраваннем падзей Слуцкага збройнага чыну і сучаснай беларускай сітуацыяй. А яно - найперш у выяўленні вытокаў раздвоенасці беларускай душы, прычын пастаянных параз шчырых клопатаў пра беларускую нацыянальную ідэю.

Традыцыйнай застаецца і ваенная тэматыка, якую ў сучаснай беларускай прозе працягвае распрацоўваць В. Быкаў ("Балота"). Але і тут аўтар выходзіць за звыклыя для такой сур'ёзнай тэмы межы. Галоўнай адзнакай твора становіцца іронія, якая часам нават мяжуе з сатырай. Прычым сатырычна паказваецца "святое святых" – беларуская партызаншчына. Яна ў творы досыць бязглуздая, а таму смешная. Аповесць і пачынаецца з таго, што героі трапляюць у досыць глупую для ваеннага часу сітуацыю. Група партызан, якая накіроўваецца на сакрэтную базу, была высаджана не там, дзе трэба. Але ў гэтым сляпым блуканні па лесе кожны імкнецца выявіць сябе дасведчаным і вельмі разумным. Назва, якую мае твор, досыць сімвалічная. Балота - на толькі месца блукання герояў, але і сімвал бездухоўнасці, амаральнасці чалавека ў час існавання таталітарнай ідэалогіі.

На мяжы старога і новага, традыцыйнага і незвычайнага будуецца сучаснае – жыццё і літаратура. Таму і беларуская аповесць сёння нясе на сабе адзнакі розных часавых праяў і па-свойму высвятляе самыя розныя характары, тэмы і праблемы, не даючы дакладных адказаў на пытанні. Ды і ці патрэбна нам гэтая дакладнасць?

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ